Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 138 (27996) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Разважанні пра сучаснасць: Павел Марыеў**

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**Milki: «Трэба верыць у свае сілы!»**



**Быць у сядле!**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:**

*«ДТСААФ павінна заняць сваё месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў для новых відаў узбраення і тэрытарыяльнай абароны. Сёння ў краіне вялікая ўвага надаецца тэрытарыяльнай абароне. Думаецца, ДТСААФ павінна рыхтаваць спецыялістаў і ў гэтым напрамку. У нас ужо наладжана цеснае і эфектыўнае ўзаемадзеянне з ДТСААФ па падрыхтоўцы спецыялістаў для авіяцыі, сіл спецыяльных аперацый, сувязі, радыёэлектроннай барацьбы. Мы будзем развіваць гэтае супрацоўніцтва і далей. Вырашаючы з арміяй сумесныя задачы, ДТСААФ Беларусі актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы краіны да абароны. Штогод у арганізацыях абароннага таварыства атрымліваюць падрыхтоўку тысячы спецыялістаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15197,00 | ▼ |
| Еўра | 16615,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 266,22 | ▼ |
| Укр. грыўня | 687,65 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НЕ СВЯТЫЯ ГАРШКІ ЛЕПЯЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гаспадар аграсядзібы ў вёсцы Навасёлкі Пастаўскага раёна Сяргей ШЧЭРБА ўжо больш за 20 гадоў займаецца ганчарствам па старажытных тэхналогіях. Ён пастаянны ўдзельнік розных фестываляў, прапагандуе сваё рамяство, перадае вопыт нават на майстар-класах, якія ладзіць непасрэдна на месцы. Напрыклад, дзесяцігадовая жыхарка Віцебска Настасся ЗАЙЦАВА атрымала першы ўрок ад вядомага ганчара падчас музычнага фестывалю ў Паставах.

■ Жыллё

## ВЯРНУЦЬ ЯК МІНІМУМ ТОЕ, ШТО ЎКЛАДЗЕНА

### Кампенсацыю дольшчыкаў «прывязалі» да стаўкі рэфінансавання

**Гэтымі днямі ў нашай краіне змяняецца парадак вяртання грошай грамадзянам пры іх выхадзе з долевага будаўніцтва, спыненні членства ў арганізацыі забудоўшчыкаў і скасаванні дагавораў куплі-продажу жылых памяшканняў, пабудаваных па дзяржзаказе. Такі новы парадак прапісаны адпаведнай пастановай.**

Дакументам вызначаецца, што цяпер памер грашовай кампенсацыі былому дольшчыку будзе залежаць ад стаўкі рэфінансавання, якая дзейнічала з даты ўнясення сродкаў дольшчыкам, членам арганізацыі забудоўшчыкаў да даты іх вяртання па спецыяльнай формуле. Такім чынам, калі чалавек уносіць тыя 100 млн рублёў і праз год выходзіць з будаўніцтва, то ён атрымае гэтую суму, памножаную на стаўку рэфінансавання плюс пэўны каэфіцыент. У выніку такога алгарытму выдаткі кліенту будуць і сапраўды кампенсаваныя.

СТАР. 2

■ Ці чулі?

## У ЧАКАННІ ПРАЗМЕРНАЙ СПЯКОТЫ

### Як на нашай краіне адбіліся самыя гарачыя шэсць месяцаў у гісторыі

**Літаральна ўчора ўсе найбуйнейшыя інфармацыйныя агенцтвы «ўзарваліся» сенсацыйнай навіной пра тое, што першае паўгоддзе 2015-га было самым гарачым за ўсю гісторыю інструментальных назіранняў.**

### НАГРЭЎСЯ АКІЯН

Эксперты Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) канстатуюць, што сярэдняя тэмпература, у тым ліку паверхні акіянаў, была на 0,85% вышэй за сярэднюю тэмпературу ў XX стагоддзі, якая складала 15,5 градуса Цэльсія.

Незвычайна высокія тэмпературы назіраліся практычна ва ўсёй Еўразіі, Паўднёвай Амерыцы, Афрыцы, Аўстраліі і на захадзе Паўночнай Амерыкі. Спецыялісты-кліматолагі са спасылкай на Цэнтр навін ААН паведамляюць, што цяпер больш за ўсіх ад спёкі пакутуюць Балканы і Паўднёвая Еўропа. На думку экспертаў, высокія тэмпературы будуць трымацца і надалей. Так, ва ўсходніх і паўднёвых раёнах ЗША спякота не збіраецца спадаць і дасягае гэтымі днямі 38-40 градусаў.



### БЕЛАРУСЬ ГАРАЧЫНЁЙ НЕ СПУЖАЕШ

Як бачым, наша планета сёлета і сапраўды моцна нагрэлася і пачынае біць усе ранейшыя рэкорды.

СТАР. 3